**В.Е.Лявончыкаў,** *доктар педагагічных навук, прафесар*

# СПЕЦЫФІКА ПРАЯЎЛЕННЯ ЗАКОНАЎ І ФУНКЦЫЙ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ КАМУНІКАЦЫІ Ў ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК

Як вядома, метатэорыя (у нашым выпадку гэта сістэма сацыякультурнай камунікацыі) выконвае трансляцыйную функцыю, гэта значыць, што яна як бы пераносіць абагульненыя веды з адной прыватнай дысцыпліны ў другую з мэтай паглыблення канкрэтных ведаў і раскрыцця агульных фундаментальных заканамернасцей і прынцыпаў вывучаемых прадметаў [1, с. 339]. Канчатковай мэтай любога даследавання з’яўляюцца выяўленне і фарміраванне законаў, функцый вывучаемай праблемы, якія маюць аб’ектыўны характар, але рэалізуюцца праз мысленне і дзейнасць людзей. Гэта значыць, што патрэбна ўлічваць сувязі аб’ектыўтага і суб’ектыўнага. Законы сацыяльнай камунікацыі адлюстроўваюць усеагульны характар інфармацыйнага абмену як атрыбутыўнай уласцівасці жывой матэрыі. Разам з тым яны выражаюць узаемасувязі ў грамадстве цалкам і яго асобных частках.

Вучоныя сфармулявалі такія законы камунікацыі, як: 1) закон узрастання камунікатыўных патрэбнасцей; 2) закон паскарэння і павелічэння аб’ему інфармацыйнага абмену; 3) закон сістэмнай арганізацыі і ўпарадкавання структур пры дапамозе камунікацыі. Акрамя таго, выдзяляюцца законы – умовы, сярод якіх для дзейнасці бібліятэк асаблівае значэнне маюць такія законы–умовы, як: 1) усякая камунікацыя ўяўляе сабою ўзаемадзеянне, яно характарызуецца абменам рознага роду інфармацыяй, значыць павінна быць не менш двух бакоў – удзельнікаў камунікацыйнага ўзаемадзеяння (напрыклад, камунікант – рэцыпіент, адрасант – адрасат, прамоўца – слухач, крыніца – прыёмнік, кніга – чытач, дакумент – карыстальнік і г.д.); 2) усякая камунікацыя як інфармацыйнае ўзаемадзеянне заснавана на прынцыпе зваротнай сувязі, якая выступае ўмовай здзяйснення камунікацыйнага акта; 3) усякая камунікацыя мае знакавы характар. Не існуе камунікацыі без пэўнай сістэмы знакаў [2, с. 21–24].

Расійскі вучоны В.А.Факееў, акрамя таго, зрабіў выснову, што для бібліятэчнай справы, бібліяграфіі прымянімы законы сумежных галін камунікацыйнай дзейнасці, у прыватнасці рэкламы. Ён

называе шэсць такіх законаў, менавіта: 1) закон інфармавання-ўпарадкавання; 2) закон кампазіцыі-прапарцыянальнасці; 3) закон развіцця і самаарганізацыі; 4) закон самазберажэння; 5) закон сінергетыкі – для любой сістэмы існуе такі набор элементаў, пры якім яе патэнцыял заўсёды будзе ці большым сумы патэнцыялаў яе элементаў, ці меншым; 6) закон максімуму прыбытку, гэта значыць аптымальнага выкарыстання ўсіх рэсурсаў сістэмы, карысці ад яе (калі сістэма прыносіць прыбытак грамадству, дык не павінна існаваць забарон прававых і маральных) [3, с. 211].

Бібліятэкі з'яўляюцца (існуюць) у сістэме дакументных камунікацый. З гэтага палажэння вынікае, што асноўная сутнасная спецыфіка яе камунікацыйнай дзейнасці праяўляецца ў тым, што прадметам зносін у бібліятэцы з'яўляецца кніга, ці больш шырока дакумент, тэкст (па тэрміналогіі В.А.Факеева "свет тэкстаў – свет карыстальнікаў"). У залежнасці ад спецыфікі (зместу) дакументаў (вучэбных, вытворчых, навуковых і г.д.) змяняюцца характар (формы, метады) абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк розных тыпаў і, вядома, змест камунікацыі (зносін) з карыстальнікамі. І хаця у бібліятэцы шмат спецыялістаў не маюць непасрэдных кантактаў з чытачамі, але яны ўдзельнічаюць у камунікацыйным працэсе апасродкавана, ускосна, бо ствараюць для карыстальнікаў бібліятэк каталогі, бібліяграфічныя паказальнікі, займаюцца камплектаваннем фонду бібліятэкі, вядуць аналітыка-сінтэтычную апрацоўку дакументаў і інш., але ўсе пералічаныя аперацыі робяцца з улікам патэнцыяльных чытачоў з мэтай наладзіць сувязь (камунікацыю) паміж дакументам і карыстальнікам.

З улікам сутнаснай спецыфікі дзейнасці бібліятэкі ў сістэме сацыякультурнай камунікацыі вучоныя – бібліятэказнаўцы і бібліяграфазнаўцы рабілі і робяць захады для выяўлення і фарміравання законаў і функцый бібліятэк. Яшчэ ў сярэдзіне ХХ ст. індыйскі вучоны Ш.Р.Ранганатан сфармуляваў пяць законаў бібліятэчнай справы, менавіта: 1) кнігі прызначаны для карыстання імі; 2) кожнаму чытачу – яго кнігу; 3) кожнай кніжцы – яе чытача; 4) зберагай час чытача; 5) бібліятэка – арганізм, які развіваецца [3, с. 210]. В.А.Факееў правамерна, на наш погляд, лічыць, што гэтыя законы з'яўляюцца прыватным выпадкам агульнага закону развіцця бібліятэчна-бібліяграфічных сістэм – функцыянальнай і дадатковай адпаведнасці [3, с. 210]. Гэта азначае, што бібліятэкі як сацыяльныя інстытуты павінны выконваць свае сутнасныя функцыі: камунікатыўную, мемарыяльную, кумулятыўную. Асабліва

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

складанай для бібліятэчнай справы (а дакладней для бібліятэкараў і бібліёграфаў) з’яўляецца рэалізацыя законаў Ш.Р. Ранганатана “кожнаму чытачу – яго кнігу” і “кожнай кніжцы – яе чытача”, якія непасрэдна адносяцца да бібліякамунікацыі. Каб кожны чытач атрымаў такую кнігу, якая б адпавядала яго мэтаваму і чытацкаму прызначэнню, бібліятэкі павінны сістэматычна вывучаць інфармацыйныя патрэбнасці карыстальнікаў. А яны, як вядома, носяць дынамічны, зменлівы характар, які ўзнікае пад уплывам знешніх і ўнутраных фактараў дзейнасці людзей. Акрамя таго, інфармацыйныя патрэбнасці ўключаны ў розныя віды дзейнасці людзей, што патрабуе выканання знешніх (сацыяльных) функцый. Вядома, у адпаведнасці з дзейнасцю прынцыпу знешняй дадатковасці больш шырокая сістэма (у нашым выпадку грамадства і яго структуры) фарміруе мэты субсістэм (бібліятэк).

А.І.Астапаў адносна бібліятэчнай справы сфармуляваў “закон папераменнага знікнення адпаведнасцей паміж структурай бібліятэчнай справы і структурай камунікатыўна-пазнавальных патрэбнасцей”, ці, у іншай фармуліроўцы, бібліякагніталагічны закон, сутнасць якога трактуецца так: функцыянальная структура бібліятэчнай справы дыялектычна ўзаемадзейнічае са структурай камунікатыўна-пазнаваўчых патрэбнасцей карыстальнікаў [4, с. 78].

У бібліяграфазнаўстве ўпершыню законы і заканамернасці развіцця бібліяграфіі зрабіў спробу сфармуліраваць А.П.Коршунаў. Ён звязаў агульны закон бібліяграфіі з яе грамадскай сутнасцю, ці, па-іншаму, з унутранымі (сутнаснымі) функцыямі бібліяграфічнай інфармацыі – пошукавай, камунікатыўнай і каштоўнаснай у сістэме дакументных камунікацый. А.П.Коршуноў назваў агульны (галоўны) закон другаснай (бібліяграфічнай) інфармацыі так: “закон аптымальнай рэалізацыі адпаведнасцей у сістэме “дакумент – карыстальнік”, ці “закон двайной адпаведнасці” [5, с. 17]. У навуковай літаратуры неаднаразова выказваліся думкі аб карэктнасці ў фармуліроўцы гэтага закону. Менавіта Н.А.Сляднева, В.А.Факееў лічаць, што трэба сцвярджаць не аб двайной адпаведнасці, а аб трайной “аўтар – дакумент – карыстальнік”. Узнікае пытанне: маюць гэтыя аўтары рацыю ці не? На наш погляд, яны маюць рацыю. Доказам можа служыць сучаснае разуменне паняцця “інфармацыя”, якое прысутнічае ў грунтоўным выданні “Інфарматыка як навука аб інфармацыі” пад рэдакцыяй вядомага расійскага вучонага ў галіне тэорыі інфармацыі Р.С.Гілярэўскага.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Сцвярджаецца, што пад інфармацыяй разумеецца змест, сэнс паведамлення, перадаваемага адным чалавекам другому [6, с. 11]. У дакументах, вядома, адлюстроўваецца інфармацыя, якая напісана пэўным чалавекам ці калектывам аўтараў. З гэтага вынікае, што карыстальнік пры рабоце (выкарыстанні) вядзе дыялог з аўтарам ці аўтарамі дакумента, а не з дакументам як каналам камунікацыі.

В.А.Факееў зрабіў спробу сфармуляваць асноўны закон бібліяграфіі так: "Закон аптымізацыі адносін кагнітыўна-інфармацыйнага ўзаемадзеяння і адпаведнасці ў сістэме "свет фіксаваных тэкстаў – свет бібліяграфіі – свет патрэбнасцей універсума чалавечых ведаў і дзейнасці" [3, с. 210]. На наш погляд, такая фармуліроўка больш адэкватна адлюстроўвае сутнасць бібліяграфіі як грамадскай з'явы.

Вывучаючы ролю бібліятэкі як часткі інфармацыйнай прасторы, Т.Ф.Берастава зрабіла выснову, што першая сутнасная функцыя бібліятэкі – камунікатыўная. «… У сацыякультурным аспекце, – сцвярджае яна, – галоўнай (сутнаснай) функцыяй бібліятэкі была і застаецца камунікацыйная, арганізатара "сустрэчы" Дакумента і Карыстальніка» [7, с. 183–184].

Аднак "сустрэча" дакумента і карыстальніка не з'яўляецца самамэтай камунікатыўнага акта. З тэорыі камунікацыі вядома, што ён выконвае наступныя мэты: папярэдзіць, інфармаваць, растлумачыць, забавіць, апісаць, пераканаць [8, с. 89]. Зыходзячы з гэтых мэт, традыцыйна ў тэорыі камунікацыі лічылася, што камунікацыя выконвае пазнавальную, інфармацыйную функцыі, ацэначную і афектыўную. Некалькі пазней амерыканскія даследчыкі Р.Дымблбі і Г.Бертан выдзелілі шэсць функцый паведамлення і кумунікатыўнага акта: папярэджанне, парада, інфармаванне, перакананне, выказванне думкі, забава [8, с. 98]. Узнікае пытанне: уласцівы пералічаныя функцыі дакументнай камунікацыі ці не? Адказ на гэта пытанне можа быць толькі станоўчым. У сувязі з гэтым у бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве распрацаваны так званыя вытворныя сацыяльныя функцыі.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

---

*1. Соколов, А.В.* Метатеория социальной коммуникации / А.В.Соколов. – СПб.: Рос. нац. б-ка, 2001. – 351 с.

2. *Основа* теории коммуникации: учебник / под. ред. проф. М.А.Василика. – М.: Гардарина, 2003. – 615 с.

3. *Фокеев, В.А.* Библиография: теоретико-методические основания: учеб. пособие / В.А.Фокеев. – СПб.: Профессия, 2006. – 352 с.

4. *Остапов, А.И.* Библиотечная когнитология: моногр. / А.И.Остапов. – Краснодар, 1995. – 331 с.

5. *Коршунов, О.П.* Библиографоведение: общий курс / О.П.Коршунов. – М., 2001. – Ч. 1. Основы теории библиографии. – 149 с.

6. *Информатика* как наука об информации: информационный, документальный, технологический, экономический, социальный и организационный аспекты / под. ред. Р.С.Гиляревского. – М.: Фаир-Пресс, 2006. – 592 с.

7. *Берестова, Т.Ф.* Общедоступная библиотека как часть информационного пространства: теоретико-методологические аспекты: моногр. / Т.Ф.Берестова. – Челябинск, 2004. – 461 с.

8. *Кашкин, В.Б.* Основы теории коммуникации: краткий курс / В.Б.Кашкин. – 3-е изд., перераб. и доп. – М.: Восток – Запад, 2007. – 247 с.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ